Блоцкая К., студ. гр. 203 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік - Пладунова Т.А .,
выкладчык

# СТЫЛЯВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЭТНАФОНІІ АБРАДАВЫХ ЦЫРЫМОНІЙ "ВАДЖЭННЯ І ПАХАВАННЯ СТРАЛЫ" НА ВЕТКАЎСКІМ ПАСОЖЖЫ

Веткаўшчына - памежны рэгіён Падняпроўя і Гомельскага Палесся, адзін з нешматлікіх рэгіёнаў Беларусі, дзе захавалася спеўная традыцыя ў яе каранёвым, аўтэнтычным выглядзе. Адмысловая з'ява Веткаўшчыны - захаванне спеўных суполак вёсак Казацкія Балсуны, Неглюбка, Янова, Стаўбун. Яны даюць нам магчымасць слухаць і вывучаць песенную традыцыю Веткаўшчыны ў натуральных умовах, шляхам вуснага пераймання "з голаса ў голас" [2, 144-145].

Абрадавая песенная традыцыя веснавога цыклу на Веткаўскім Пасожжы прадстаўлена жаночай спеўнай суполкай і характэрызуецца наступнымі этнафанічнымі прыкметамі: выскокая тэсітура спеваў (соль першай актавы - м і другой актавы); моцная падача гуку, "голасныя" спевы на адкрытым паветры; надрыўная, на мяжы плачу-крыку манера спеваў; рэчытатыўна-сігнальны тып інтанавання; насычаная тэмбрава-фактурная палітра - гетэрафонныя спевы "з пералівамі" на бурдоннай аснове, калі асноўная мелодыя "памнажаецца" праз арнаментальныя апяванні 2-3-х галасоў і падмацоўваецца бурдонным варыянтам. Для гэтых песень характэрны інтанацыі клічнага, заклінальнага, урачыста-веснавога і сумна-тужлівага характару. Асаблівую ўвагу ў працэсе засваення песень варта ўдзяліць этнафанічнаму аналізу прапяваемых галосных, якія ў выніку пеўчай рэдукцыі якасна змяняюцца [4, 69].

Асабістае месца ў рэгіёне Веткаўскага Пасожжа належыць абраду "Ваджэнне і пахаванне стралы". Гэты абрад пачынаўся ў Неглюбцы пасля Вялікадня і працягваўся да Ушэсця, ствараючы ўмоўную песенную прастору

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж  дзесяццю Веткаўскімі вёскамі і суседнімі сёламі Браншчыны. У першы велікодны тыдзень, які называлі “святы”, жанчыны і дзяўчаты збіраліся невялікімі групамі амаль кожны дзень, каб пасьпяваць “стрэльныя” песні. [5, с. 225].

Ход свята на Ушэсце, напрыклад, у Неглюбцы, мае тыповы набор рытуальных дзеянняў, уласцівых для абраду “пахавання стралы” і характэрных для ўсіх  вёсак рэгіёна: збор двюх груп удзельнікаў у розных канцах вёскі, апрананне “старцоў” (жанчыны “на мужчыну”, мужчыны “на жанчыну”), ваджэнне карагодаў (кругавых і “крывым танком”), шэсце радамі па вуліцы пад спевы “Ішла страла ў канец сяла...” і інш., гульні, закопванне “стралы”, “старца”.  “Старцы” ўзначальваюць шэсце і ў супрацьвагу шчыльным радам жанчын, з іх паступовым, няспешным рухам, ўвесь час павінны быць дынамічнымі і актыўнымі - палохаць новых удзельнікаў, бегаць за дзецьмі, весці жартоўныя размовы з сустрэчнымі і г.д. Такі кантраст дзеянняў і гукаў стварае асаблівую атмасферу - чым больш павялічваецца колькасць удзельнікаў, тым больш рухомымі і гаваркімі робяцца “старцы”, а спевы жанчын гучаць больш напружана. Кульмінацыйным момантам можна назваць шэсце “ў жыта”. У полі жанчыны стоячы спявалі, “старцы” качаліся па жыце (“завядзём старцоў у жыта”, “прывяжуць старцоў да жыта…”, “павядуць, і старца схароняць”). Пры вяртанні ў вёску выконвалі граныя, палотныя і “гадзінныя” (жніўныя) песні. [5, 225-226].

Абрад “Ваджэння і пахаванне Стралы” быў для жыхароў вёсак Веткаўшчыны адным з найбольш значных у каляндарным годзе. Гэта было свята, якое не толькі садзейнічала росту хлябоў, але і ахоўвала ўраджай і людзей ад навальніцы з градам, засухі. Для моладзі памежны час вясны-лета быў перыядам,  які спрыяў складанню шлюбных пар. Асабліва важным час ад Вялікадня да Ушэсця быў для маладых дзяўчат.

Як  адзначаюць даследчыкі абраду, раней менавіта дзяўчаты былі асноўнымі удзельнікамі свята  [3, 1]. Акрамя дзяўчат асаблівую групу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдзельніц складалі “малодкі” - бядзетныя жанчыны ў першы год пасля вяселля, якія па сваім сацыяльным статусе знаходзіліся паміж дзяўчатамі і жанчынамі. Аналіз абрадавых дзеянняў, якія суправаджаюць карагоды, паказвае, што ў аснове ”ваджэння і пахавання стралы” ляжыць ахоўная магія, якая ўдзельнікамі ўсведамляецца іншы раз яшчэ і цяпер: пяюць дзеля таго, каб уберагчыся “ад перуна”, як бы закапываюць маланку, каб не бліскала ў вёсцы. Аднак з цягам часу ахоўная магія дапаўнялася аграрнай, у прыватнасці, карпаганічнай, а таксама любоўнай. [1, 55-57].

Менавіта ў вялікай колькасці карагодаў абрад “стралы” атрымаў найвялікшае паэтычнае напаўненне. Тэматыка карагодных тэкстаў “стралы” ў большасці сямейная. Многа песень “стралы” прысвечана каханню. У некаторых сюжэтах карагодаў арганізуючым звяном  выступае драматычнае дзеянне. Найбольш маляўнічым з іх з’яўляецца “Дряма”, дзе ў цэнтры сядзіць жанчына і прадзе кудзель. Яна адмаўляецца ўстаць і месці хату нават калі ёй гавораць, што едуць свёкар, свякроў, маці, бацька. І толькі калі яна дазнаецца, што едзе мілы, яна падхопліваецца і мяце хату. У карагодзе “Лука” дзве шэрэнгі рухаюцца насустрач адна адной па прамавугольніку, у вуглах якога стаяць дзеці. Іграваым закручваннем “рукава” карагода адрозніваецца “Крывы танок”. Але класічнай і найбольш распаўсюджанай формай карагода “стралы” з’яўляецца рух па кругу спачатку злева направа, па сонцу, а потым наадварот. Гэта падпарадкавала і кампазіцыйную пабудову тэкстаў, якая строга падпарадкавана кругавому руху: старажытная аднарадковая рытмічная страфа + характэрны заклікальны прыпеў “Ох і ой люлі” і паўтор другой часткі першага радка. У песнях многа эпітэтаў, сімволікі, трохкратных паўтораў. Шырокая насычанасць памяншальна-ласкальнымі суфіксамі стварае глыбокае эмацыянальнае гучанне. Рытмічная завершанасць структуры песен “стралы” расквечваецца разнастайнасцю прыпеваў: “Ой-лі, вой, люлі”, “Вой люлі, вой люлі”, “Лёлюшкі-лёлі”, “Ой, лёлі, ой, лёлі” і да т. п.

З 2001 года студэнтамі і педагогамі БДУ культуры і мастацтваў наладжваюцца культурна-антрапалагічныя экспедыцыі ў Веткаўскі раён. На экспедыцыі 2009 года давялося пабываць і мне. Вельмі прыемна было не проста назіраць за ходам свята, а стаць непасрэдным удзельнікам абраду, які мы назіралі у Казацкіх Балсунах, а затым у Неглюбцы. Старажылы гэтых вёсак прынялі нас у свае спеўныя шэрагі, папераменна з намі спявалі “стрэльныя” песні. Разам з усімі мы прынялі удзел у качанні ў жыце, і ў “хаванні” стралы- маланкі ў жытняе поле. (Кожны жадаючы закопваў нейкую бліскучую рэч на мяжы поля, каб маланка не ўдарыла ў яго хату).

Вынікам экспедыцыі з маім удзелам з’явіліся аўдыё-відэазапісы паводле абрадавай этнафоніі свта. Прааналізаваўшы гэты аўдыё- і відэаматэрыял можна зрабіць выснову, што ў аснове карагода “страла” ляжыць арыгінальны тыповы напеў-формула, які арганічна аб’ядноўвае вялікую колькасць меладычных варыянтаў і паэтычных тэкстаў. Для кожнай вёскі Веткаўшчыны характэрна некалькі сваіх тыпавых напеваў. Напрыклад, у вёсцы Казацкія Балсуны можна вылучыць два тыпавыя напевы: I - да песні “Як пушчу стрялу”; II - “Ох ты ластаўка, ты касістая”; III – “Што й на нашай, на вуліцы”; IV – “Ні жар загаряя” .У вёсцы Неглюбка песні выконваюцца таксама на свае адметныя тыпавыя напевы. У вёсцы Стаўбун - таксама вылучаюцца дзве мелодыі-формулы: на I напеў спяваюцца тэксты “Ой, ідзі, страла”, “Мой алешнічак, мой зялёненькі”, “Ой у садзіку, пад ігрушаю”, “У майго таткі харашо жыці”; на II – песні “Па вуліцы, па шырокай”, “Жана й мужа не ўзлюбіла”, “На гарэ лён, белы кужаль”; на III – “Па садочку бег малойчык”, “Наша й вуліца была да шырокая”; на IV – “Я скакала, плясала”; на V –“А ў крывога танца”. У вёсцы Неглюбка намі былі вылучаны песні, дапасаваныя да тыпавых напеваў I - “Ляцела стряла”, “Я па тыну хаджу, я рамон саджу”, II -“Ой, павецяй-ка ветры буйныя”; III - “Ой ты саду ты мой саду”, “Раскідаўся дуб зялёны”[1].

---

[1] Прыведзеная нумерацыя тыпавых напеваў не адпавядае этнамузыкалагічным сістэмам і адлюстроўвае ўласны даследчы вопыт па сістэматызацыі бытуючых у названых вёсках інтанацыйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Характэрна, што многія з тыпавых напеваў “вандруюць” па Веткаўскім і Бранксіх вёсках амаль у нязменным выглядзе (“Як пушчу стралу”, “Я скакала-плясала”), іншыя маюць сваю непаўторную рытма-інтанацыйную адметнасць.

Аднак асноўным, агульным дзеля ўсіх вёсак Веткаўшчыны з’яўляецца тыповы напеў-формула “Як пушчу стрялу”, які мае розныя вербальныя варыянты на адзіную тыпавую мелодыю. Гэты напеў у абрадзе паўтараецца часцей за астатнія і займае цэнтральнае, вядучае месца.

Напрыканцы магчыма заключыць, што ўсе тыпавыя напевы абраду “Ваджэння і пахавання стралы”, характэрныя для Веткаўскага Пасожжа з’яўляецца яго этнафанічнай візітоўкай, своеасаблівым акустычным кодам рэгіёну. Магчыма сіламі студэнтаў спецыялізацыі “Этнафоназнаўства” і іншымі навукова-творчымі суполкамі надалей будзе працягвацца вывучэнне і папулярызацыя гэтай яскравай, ўнікальнай спеўнай традыцыі, а збоку работнікаў культуры і адукацыі Веткаўскага раёна будзе больш якасны падыход дзеля яе захавання і прадаўжэння праз творчасць дзяцей і моладзі.

Літаратура:

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Трад. жанры: Гомел. вобл. /Уклад.В.А. Захарава і інш.; Уклад. муз . часткі У.І. Раговіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1989.-384 с.: іл., нот. іл.

2. Гаўрыловіч А. Фарміраванне спеўнай культуры моладзі на дакументальнай аснове і асаблівасці калядных песень Веткаўшчыны//Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып.2. Матэрыялы ІІІ Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (19-20 крас. 2006 г., г.п. Акцябрскі) / аўт. праекта і ўклад. М.А.Козенка. – Мн.: БелДІПК, 2006. –224 с.: іл.

---

рытмічных формул. На наш погляд дадзены метад спрыяе больш паслядоўнаму і інтэнсіўнаму развучванню абрадавых песень.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Гусев В.Е., Марченко Ю.И. «Стрела» у русско-белорусско-украинском пограничье./ Этнографические истоки фольклорных явлений. Русский фольклор. Т.XXIV – Л.1987.

4. Пладунова Т. Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы»// Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне: зборнік навуковых прац удзельнікаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29-30 красавіка 2010 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. Рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2010. – 168 с.

Смірнова І.Ю. Песенная прастора вясны. Ушэсце ў Неглюбцы. Матэрыялы II Міжнароднай навуковай фальклорна-этналінгвістычнай канферэнцыі "Комплекснае даследванне фальклору і этнакультуры Палесся". Мн., 2005.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ